# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ВЕРАСЕНЬ!




**Па гарызанталі: 4.** «Дзень добры, верасень!//Дзень добры, ...!» З верша М. Чарняўскага «Звініць званок». **7.** «Адплывае ў просінь лёгкі ... .//Сёння роўна ў восем зазвініць званок». З верша А. Вольскага «Зазвініць званок». **8.** «Міхась звярнуўся к «дарактору»://- А не паслухае каторы -//Цягні за ... на калені://Знайду лякарства я ад лені». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Дарэктар»). **9.** Навука не піва, у ... не ўвальеш (прык.). **10.** Які бацька кожны дзень дзяцей пералічвае? (заг.) **12.** Тое, што і нашэнне. **15.** Ежа праганяе ..., веды вылечваюць ад невуцтва (кітайская прык.). **17.** Тое, што і баец. **18.** Кніга — ... у свет ведаў (прык.). **21.** «Нам даруе ...//Восень-чараўніца». З верша Г. Дашкевіч «Першага верасня». **22.** Дзікі асёл, які водзіцца ў Азіі. **25.** «—Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца\\ як след за кнігі ўзяўся.//— Дык ты ведаеш, бабуля, -... сапсаваўся». З верша А. Дзеружынскага «Пачаў лепш вучыцца». **30.** Хто ведае аз і букі, таму і кнігі ў ... (прык.). **31.** «Апусцела ...,//Толькі людна ў школе». З верша С. Грахоўскага «Верасень». **32.** Што край, то абычай, што ..., то навіна (прык.). **33.** Дурному навука, што дзіцяці ... (прык.). **34.** ... сёньняшні — вучань учарашняга (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Законччаны цыкл, увесь аб'ём спецыяльнага навучання. **2.** З ручайка — ..., з кніг — веды (прык.). **3.** Медны духавы інструмент. **5.** Твор, праца (жарт.). **6.** Плот, тын. **9.** «А ў Максіма,//А ў Максіма -//Сёння ... за плячыма». З верша К. Цвіркі «У школу». **11.** Буйная жвачная жывёліна. **13.** «А ... верасень//Дзверы зноў адкрыў». З верша Н. Гілевіча «Адзвінелі песнямі». **14.** Абазначэнне ацэнкі ведаў і паводзін навучэнцаў. **15.** ... не хвароба, гады не адбірае (прык.). **16.** Слоўнікавы склад мовы. **19.** Сшытак — ... вучня і настаўніка (прык.). **20.** «І нас паклікаў ...\\У школу на заняткі». З верша В. Віткі «Як птушкі, склалі крылы». **23.** Мастацкі жанр у жывапісе, скульптуры, кінематаграфіі. **24.** Прасвет у чым-небудзь (перан.). **26.** «Бывай, ... звонкае !\\Крочым мы ў школу». З верша П. Пранузы «У клас расчыненыя дзверы». **27.** «... пра восень прачытаю\\ дзясятку атрымаю». З верша К. Маскалік «Верш пра восень я складу». **28.** Паветраны шар для метэаралагічных назіранняў. **29.** Гора табе, ..., калі цябе карова коле. (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 4. Школа. 7. Туманок. 8. Вуха. 9. Рот. 10. Настаўнік. 12. Носка. 15. Голад. 17. Воін. 18. Мост. 21. Свята. 22. Анагр. 25. Тэлевізар. 30. Рукі. 31. Поле. 32. Старана. 33. Агонь. 34. Дзень. **Па вертыкалі:** 1. Курс. 2. Рака. 3. Горн. 5. Опус. 6. Агароджа. 9. Ранец. 11. Як. 13. Сягоння. 14. Адзнака. 15. Грамата. 16. Лексіка. 19. Люстэрка. 20. Верасень. 23. Ню. 24. Акно. 26. Лета. 27. Верш. 28. Зонд. 29. Воле.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.20 | 19.56 | 13.36 |
| Віцебск — | 6.08 | 19.48 | 13.40 |
| Магілёў — | 6.10 | 19.47 | 13.37 |
| Гомель — | 6.10 | 19.41 | 13.31 |
| Гродна — | 6.36 | 20.11 | 13.35 |
| Брэст — | 6.39 | 20.09 | 13.30 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 5 верасня. Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

*Пр. Васы, Аляксандра, Паўла, Фадзея.*
*К. Ізабелы, Рыгора, Шымана, Яўхіма.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +22..+24°С | КІЕЎ +25..+27°С | РЫГА +18..+20°С |
| ВІЛЬНЮС +20..+22°С | МАСКВА +13..+15°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +18..+20°С |

Даты | Падзеі | Людзі

**3 ВЕРАСНЯ**

**1793** год — рашэннем сейма Рэчы Паспалітай распушчана Таргавіцкая канфедэрацыя (аб'яднанне шляхты Рэчы Паспалітай з мэтай вяртання палітычнай сістэмы дзяржавы і шляхецкіх правоў, ліквідаваных Канстытуцыяй 3 мая 1791 года; канфедэрацыя была арганізавана па ініцыятыве Кацярыны ІІ у 1792 годзе) і створана Гродзенская канфедэрацыя; прынята новая, так званая Гродзенская канстытуцыя, якая аднавіла ўсе ранейшыя прывілеі шляхты, у тым ліку прынцып ліберум вета.

**1875** год — нарадзіўся Фердынанд Поршэ, нямецкі канструктар аўтамабіляў, заснавальнік кампаніі Porsche. Але перш за ўсё ён вядомы як стваральнік самага папулярнага аўтамабіля ў гісторыі галіны, які ўвайшоў у гісторыю пад імем «Фальксваген Kafer», або «Жук». Кажуць, калі б Поршэ стварыў толькі «Жука», ён усё роўна стаў бы вядомы як геній машынабудавання.



**1939** год — урады Вялікабрытаніі і Францыі выступілі з заявай аб аб'яўленні вайны фашысцкай Германіі. Вялікабрытанія ўдзельнічала ў Другой сусветнай вайне з самага яе пачатку, калі аб'явіла вайну Германіі, і да самага яе канца — да дня падпісання Акта капітуляцыі Японіі — 2 верасня 1945 года. Першым крокам Вялікабрытаніі ў ваенных дзеяннях сталі скінутыя на тэрыторыю Германіі 13 тон антыфашысцкіх лістовак. Вялікабрытанія мела моцны флот і паветраныя войскі. Колькасць брытанскай арміі складала 1 млн 270 тыс. чалавек. Францыя пачала ўзброеную барацьбу праз два тыдні пасля абвяшчэння вайны. Французскі план вядзення вайны супраць Германіі, у адпаведнасці з ваеннай дактрынай французскага камандавання, прадугледжваў абарону на «лініі Мажыно» і ўступленне войскаў у Бельгію і Нідэрланды, з мэтай абароны партоў і прамысловых раёнаў Францыі і Бельгіі.

**Было сказана**

**Анатоль КУДРАВЕЦ, паэт:**
*«Жорсткасць, як і боль, даецца чалавеку для самазахавання».*

## ■ Не прапусці!

# СПАТКАННЕ... З КАЖАНАМІ

**На «Ноч кажаноў» запрашаюць мінчан 4 верасня Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах і грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Мерапрыемства ладзіцца ў рамках міжнароднай акцыі International Bat Night.**

Кажаны — не героі кашмарных сноў і фільмаў жахаў. Гэта рэальныя звяркі, якіх можна сустрэць і ў горадзе, і ў сельскай мясцовасці. Яны прылятаюць зусім не для таго, каб выпіць кроў чалавека і заблытацца ў яго валасах. Іх роля ў прыродзе куды больш высакародная: яны знішчаюць шмат насякомых, апыляюць расліны і дапамагаюць рассяваць насенне.

Што насамрэч ядуць кажаны? Як ім удаецца спяваць? Чаму яны вядуць начны лад жыцця? Колькі жывуць? І што рабіць пры сустрэчы з імі? Пра ўсё гэта можна будзе даведацца падчас лекцыі, якую прачытае навуковы супрацоўнік Аляксей Шпак. Яна адбудзецца ў НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах (вул. Акадэмічная, 27, ст. метро «Акадэмія навук», актавая зала, каб. 331). Пачатак у 19.30. Спецыялісты з задавальненнем адкажуць на ўсе пытанні, якія цікавяць слухачоў...

А ў 21 гадзіну распачнецца экскурсія па парку Горкага. Меса сустрэчы — галоўны ўваход. Калі пашанцуе з надвор'ем, то за кажанамі можна будзе паназіраць з дапамогай ультрагукавой тэхнікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сямейнае шчасце — гэта калі цябе разумеюць, але не да такой ступені, каб знаходзіць тваё заначкі.**

На сайце знаёмстваў.
Ксенія, учора, 13:22:
— Добры дзень! У вас вельмі прыемная знешнасць! Мяне цікавяць толькі сур'ёзныя адносіны, на ўсё іншае няма ні часу, ні жадання; калі ў вас такі ж намер, пакіньце свой кантакт для сувязі. Мой асабісты консультант дамовіцца аб сустрэчы!
Антон, сёння, 10:55:
— Ды глупства-пытанне, зараз дам заданне свайму дварэцкаму.

**Добрая вахцёрка — галоўная прычына цяжарнасці дзяўчат у інтэрнаце.**

Муж прыходзіць дадому і бачыць за парцьеркай босыя ногі. Да жонкі:
— Гэта што такое?
— А што ты думаеш, што ўсе мае ўпрыгажэнні, футра — гэта на тваю зарплату?
— Я пытаюся: што гэта такое?
— А кватэра, машына — на тваю зарплату?
— Гэта што такое?
— А як ты думаеш, чаму ты атрымаў такую высокую пасаду?
— Я апошні раз пытаюся: чаму карміцель басаног стаіць?!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе атрыманыя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3386.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 2 верасня 2015 года.